


# Гродзенскі УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

Выдаецца з 1986 года ● *№ 8 (279)* ● *31 жніўня 2000 года, чацвер*

Выходзіць адзін раз на месяц ● Распаўсюджваецца бясплатна


# З НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДАМ!

## ПОСПЕХАЎ ВАМ!

Вось і яшчэ адзін навучальны год распачынае свой разбег. 1 верасня аўдыторыі і лабараторыі запоўняцца студэнтамі. Пачнуцца лекцыі, семінарскія і лабараторныя заняткі — звычайнае жыццё вышэйшай навучальнай установы. Здавалася б, усё звыкла, усё ідзе па аднойчы заведзеным парадку. Гэта так. І ўсё ж пачатак сёлетняга навучальнага года адметны тым, што гэты год — юбілейны для універсітэта. Наша ВНУ ў пачатку сакавіка адзначыла свой 60-гадовы юбілей. 60-ы раз садзяцца за парты і сталы студэнты гродзеншчыны. Варта толькі ўдумацца, колькі за гэты час адбылося розных зменаў. А універсітэт стаіць на сваім месцы і няўхільна працягвае выконваць сваю высакародную задачу — падрыхтоўку высокаадукаваных спецыялістаў для рэгіёну. Нашы выпускнікі сталі вядомымі людзьмі не толькі ў рэспубліцы, але і за яе межамі. Хочацца верыць, што і новыя пакаленні студэнтаў будуць дастойна працягваць добрыя традыцыі ГрДУ, будуць добра вучыцца, авалодваць ведамі, каб прынесці карысць Радзіме, каб стаць спецыялістамі і прыстойнымі людзьмі. Поспехаў вам!

**РЭКТАРАТ, ПРАФКОМ, САВЕТ ВЕТЭРАНАЎ.**

## НЕПАЎТОРНЫЯ МОМАНТЫ

**Каму з нас не даводзілася хоць раз у жыцці здаваць экзамены? У школе, у вышэйшай навучальнай установе ды і непасрэдна ў жыцці мы штораз праходзім выпрабаванне — на падрыхтаванасць, на сталасць, на мудрасць, кемлівасць. Але ўступныя экзамены — яны асаблівыя, непаўторныя. Для большасці экзаменуемых яны бываюць толькі раз у жыцці. Прайшоў выпрабаванні — і... ты — студэнт.**

**Сёлетнія ўступныя экзамены амаль нічым не адрозніваліся ад такіх самых іспытаў мінулых гадоў. Тыя ж урачыстасць, цішыня, дасціпнасць ва універсітэцкіх аўдыторыях. Тая ж чарга да дзвярэй прыёмнай камісіі. Камусьці пашчасціла, хтосьці стаў студэнтам. А тыя, хто не вытрымаў экзаменаў альбо не прайшоў па конкурсе, вымушаны альбо шукаць работу, альбо спрабаваць свае сілы ў іншых навучальных установах ці чакаць яшчэ год, напружана чакаць і рыхтавацца, каб паступіць ва універсітэт. Ці... ісці служыць у войска. Не вельмі прыемная перспектыва. Першакурснікі не павінны на яе забывацца. Бо яны яшчэ не зусім студэнты. Як гаворыць мудрасць: курыца — не птушка, першакурснік — не студэнт! Вучыцеся, радуйцеся жыццю і таму, што вы — студэнты! Віншуем!**







***ЦИТАТА НОМЕРА:***

***«Надо много учиться, чтобы знать хоть немногое». Шарль Монтескье.***

# ПОПУЛЯРНАЯ ПРОФЕССИЯ







Юридический факультет — один из наиболее крупных факультетов университета. Здесь обучаются 1900 студентов — 1000 на стационаре и 900 — на заочном отделении. Специальность правоведа пользуется неизменной популярностью у абитуриентов. Конкурсы при поступлении на юрфак неизменно высокие. Так, с 1997 по 1999 год конкурс составлял соответственно по 5,3; 3,88 и 3,147 человека на одно место. Исключением не был и нынешний год: рейтинг юрфака по-прежнему высок. Из числа абитуриентов отбираются, как правило, лучшие, наиболее подготовленные юноши и девушки.

На факультете есть возможности получить достаточный багаж знаний. Занятия ведут 6 профессоров, 28 доцентов. Имеются 2 компьютерных класса, 3 лаборатории, кабинет законодательства. Практику студенты проходят во всех правоприменительных органах города.

**НА СНИМКАХ: лекцию читает профессор Г.А.ЗОРИН; идут аудиторные занятия.**

**Фото Игоря ЯРОШЕВИЧА.**

## ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА

**Рэктарат, прафком, савет ветэранаў віншуюць з юбілеем і жадаюць моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту, поспехаў юбілярам. Нагадваем, калі і каго можна павіншаваць.**

- 7 верасня — **Яўгена Уладзіміравіча ПІУЛЬСКАГА** — загадчыка кафедры паліталогіі і сацыялогіі.
- 7 верасня — **Святлану Сяргееўну МАРДЭЧКА** — старшага выкладчыка кафедры рускай і замежнай літаратуры.
- 10 верасня — **Валерыя Канстанцінавіча БОЙКУ** — дэкана матэматычнага факультэта.
- 14 верасня — **Васіля Іванавіча ВАРНАКОВА** — старшага выкладчыка кафедры эканомікі і арганізацыі камерцыйнай дзейнасці.
- 15 верасня — **Аляксандра Уладзіміравіча БОГУША** — намесніка рэдактара часопіса «Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта».
- 16 верасня — **Наталлю Аляксандраўну ЗОРЫНУ** — старшага выкладчыка кафедры замежных моў.
- 20 верасня — **Галіну Георгіеўну МАЦВЕЙЧЫК** — вядучага эканаміста планава-эканамічнага аддзела.
- 26 верасня — **Наталлю Андрэеўну МЕШЧАРАКОВУ** — старшага аператара ВЦ.

*ЗАМЕТКІ З ПРАКТЫКІ*

# УПЕРШЫНЮ Ў ЖЫЦЦІ

**Вера ГУРЫНОВІЧ,**
**студэнтка IV курса факультэта гісторыі і культуры**

Сёлета мы ўпершыню пераступілі парог школы ў якасці настаўнікаў. Мы — гэта студэнты V курса факультэта гісторыі і культуры Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы Аляксандр Пелеш, Аляксандр Жданюк, Андрэй Абражэвіч, Вера Гурыновіч. Пад кіраўніцтвам нашых выкладчыкаў Г.М. Крывашчокага і М.В. Васілючака 4 тыдні ў школе №18 г. Гродна праходзілі педагагічную практыку.

Нас ветліва сустрэлі ў школе. Дырэктар Мікалай Пятровіч Купрэеў расказаў аб жыцці сваёй школы, аб вучнях і настаўніках.

Кожны з нас павінен быў правесці па 4 заліковыя ўрокі гісторыі ў 5-х класах. Настаўніца гісторыі Наталля Аляксандраўна Маркевіч дапамагала нам. Дзякуючы ёй першыя нашы ўрокі прайшлі добра. Мы змаглі ўявіць сябе сапраўднымі настаўнікамі.

Правялі таксама цікавую гульню сярод вучняў 5-х класаў. Гэта быў «Брэйнрынг» на тэму «Старажытны Усход». Мяркуем, што дзеці атрымалі задавальненне. Наогул, практыка прайшла весела, разам з тым і з карысцю для нас, студэнтаў.

# НАВУКОВЫ ПАТЭНЦЫЯЛ РАСЦЕ

***По матэрыялах даклада прарэктара па навуковай працы, кандыдата фізіка-матэматычных навук В.В.Сянько на пасяджэнні Савета універсітэта***

У 1999 годзе навуковая дзейнасць універсітэта праводзілася ў знешніх умовах, якія не адрозніваліся значна ад умоў 1998 года. Універсітэт разам з падрыхтоўкай высокакваліфікаваных кадраў, кадраў вышэйшай кваліфікацыі праз дактарантуру іншых ВНУ, гранты для абароны доктарскіх дысертацый, аспірантуру, магістратуру, іншыя формы павышэння кваліфікацыі праводзіў даследаванні ў межах дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм НАН Беларусі і міжінстытуцкіх праграм, асобных праектаў фонду фундаментальных даследаванняў, Міністэрства адукацыі РБ, універсітэта, гаспадарчых дагавораў па заказах прадпрыемстваў.

У складзе універсітэта ў якасці суб'ектаў навукова-даследчай дзейнасці працавалі ІПК і ПККС, навукова-даследчы сектар, 60 кафедр, 5 навукова-даследчых лабараторый, цэнтр сацыялагічных даследаванняў.

Агульная колькасць штатных супрацоўнікаў універсітэта, занятых у навуковай сферы, склала 647 чалавек (1998 — 590 чал.), прафесарска-выкладчыцкі склад — 620, у тым ліку універсітэт — 612, ІПК і ПККС — 8 (1998 г. — 588/585/3), штатных супрацоўнікаў навуковых падраздзяленняў, разам з ІПК і ПККС — 35) (1998 г. — 16). З 647 супрацоўнікаў доктараў навук — 31, кандыдатаў навук — 248 (1998 г. — адпаведна 29/234).

Падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі ва універсітэце вялася ў 1999 годзе праз аспірантуру па 34 спецыяльнасцях, магістратуру — па 18 спецыяльнасцях (1998 г. — 34/13 адпаведна).

Абаронена 2 доктарскіх, 20 кандыдацкіх дысертацый (1998 — 3/15). Аспірантамі універсітэта абаронена 11 кандыдацкіх дысертацый, у тым ліку 4 падчас вучобы ў аспірантуры, 7 — на працягу 3-х гадоў пасля сканчэння вучобы. Адпаведна ў 1998 годзе — 5, 1, 4.

Працягвалася праца 3 саветаў па абароне кандыдацкіх дысертацый, у якіх абаронена 12 кандыдацкіх дысертацый (1998 — 1).

Скончылі вучобу ў магістратуры 43 магістранты (дзённая форма — 21, вячэрняя форма — 22) (1998 — адпаведна 7/10). У 1999 годзе залічаны 54 магістранты.

Паспяхова абаранілі магістэрскія дысертацыі 35 магістрантаў, у тым ліку 1 выпускнік 1998 года (1998 — 14 магістрантаў).

Па розных формах прайшлі павышэнне кваліфікацыі 92 выкладчыкі (15,4 % ад агульнай колькасці ППС), 8 супрацоўнікаў (0,6% агульнай колькасці іншых супрацоўнікаў). У 1998 годзе адпаведна 84 выкладчыкі (15,4%) і 8 супрацоўнікаў. Усяго за межамі РБ — 9 чал. (1998 — 10).

Выдзелены 2 гранты для падрыхтоўкі доктарскіх дысертацый агульным аб'ёмам 575,4 млн. руб. (1998 — 1 грант, аб'ём — 60 млн. руб. на 01.01.99 г. атрымана). Па-за межамі універсітэта 3/2 грантаў аб'ёмам 979,4 млн. руб. (1998 — 2/ — 258,2 млн. руб.).

Па плану ў 1999 годзе выконваліся 158 тэм, 64 — за кошт другой паловы працоўнага дня выкладчыка, 69 — дзяржбюджэтных фінансуемых, 3 — гаспадарчых, сродкі універсітэта — 22 (1998 г. — 136/71/60/5/1 — адпаведна).

Па праграмах усіх узроўняў выконваліся 34 тэмы (1998 — 35 тэм).

Навуковымі калектывамі універсітэта выканаin навуковыя даследаванні коштам 65633,1 млн. руб. (дол. ЗША па курсу НБ на канец 1999 г. — 219000), у тым ліку дзяржбюджэтныя (фонд фундаментальных даследаванняў — 4615,8 млн. руб., дзяржаўныя навукова-тэхнічныя праграмы — 2774,6 млн. руб., бюджэт МА РБ — 51076 млн. руб., іншыя бюджэты — 780 млн. руб.), гаспадарчыя дагаворы — 1835,3 млн. руб., сродкі універсітэта — 4461,4 млн. руб.) (1998 год адпаведна: усяго — 8487,5 млн. руб. (дол. ЗША па курсу НБ на канец 1998 г. — 79322), у тым ліку МА РБ — 5083, 3 млн. руб., ФФД — 758,3 млн. руб., ДНТП — 990 млн. руб., іншыя бюджэты — 417, гаспадарчыя дагаворы — 1088,4, сродкі універсітэта — 150,5 млн. руб. адпаведна).

На выплату заработнай платы накіравана 31180,3 млн. руб. — 47,5% усіх сродкаў, на абсталяванне — 31,6% усіх сродкаў (1998 г. — 60%/5% адпаведна).

Аналіз паказвае, што найбольшую частку сродкаў універсітэт атрымлівае ад МА РБ (78% ад усіх сродкаў).

Па выніках даследаванняў апублікавана 1341 праца. Сярод іх 16 манаграфій, 7/40 падручнікаў і дапаможнікаў, у тым ліку 5/3 з грыфам МА РБ; 949 артыкулаў, у тым ліку 217 у часопісах. У 1998 годзе адпаведна — 1268 прац, 7 манаграфій; 6/41 — падручнікаў і дапаможнікаў, у тым ліку з грыфам МА РБ — 3/5, артыкулаў — 898, у тым ліку ў часопісах — 153.

Ацэнку эфектыўнасці навуковых даследаванняў па фармальных паказчыках можна зрабіць па колькасці публікацый, укараненняў распрацовак у вытворчасць і навучальны працэс колькасці экспанатаў на выставах, конкурсах, выніках вынаходніцкай працы.

З 158 тэм 7 з'яўляліся ахоўваздольнымі (4,5% ад агульнай колькасці тэм) (1998 — 136/4% адпаведна). У навучальным працэсе выкарыстана 114 распрацовак, на вытворчасці — 12 (1998 г. — 78/24 адпаведна). Універсітэтам праведзена 28 канферэнцый, з іх 7 міжнародных, 4 рэспубліканскіх (у тым ліку студэнцкіх — 1), 3 рэгіянальных (з іх 3 студэнцкіх), 14 універсітэцкіх (з іх 8 студэнцкіх) (1998 — 35/10/4/3/15). На выставы было накіравана 177 экспанатаў (1998 г. — 149).

Агульны кошт абсталявання, купленага за 1999 год, склаў 51873,0 млн. руб., у тым ліку за кошт сродкаў НДС 22080,7 млн. руб. (1998 г. — 9542,8 млн. руб./ 458,5 млн. руб. адпаведна).

Пры гэтым накіравана на закупку вылічальнай тэхнікі 29202,0 млн. руб. (1998 г. — 6857,4 млн. руб.), кантрольна-вымяральнага абсталявання 6892,0 млн. руб. (1998 г. — 32,4 млн. руб.), эксперыментальнага і лабараторнага абсталявання 15779,0 млн. руб. (1998 г. — 135,5 млн. руб.).

У адпаведнасці з «Канцэпцыяй развіцця навукі ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы на перыяд да 2005 года» асноўная ўвага супрацоўнікаў кафедр, факультэтаў, калектыва універсітэта ў галіне навуковай дзейнасці была накіравана на: падрыхтоўку спецыялістаў, якія задавальняюць патрабаванням стандартаў і грамадства РБ, з неабходнай глыбінёю спецыялізацыі для навуковай, навукова-адукацыйнай і вытворчай дзейнасці; развіццё навукова-педагагічнага патэнцыялу універсітэта; падрыхтоўку неабходных умоў для развіцця навукова-вытворчай і інавацыйнай дзейнасці.

У 1999 годзе універсітэт упершыню ў гісторыі Беларусі сярод ВНУ рэгіёнаў узначаліў міжінстытуцкую праграму «Дынамічныя сістэмы» (навуковы кіраўнік — доктар фізіка-матэматычных навук, загадчык кафедры С.А. Мінюк). Распачата работа над комплексным міжінстытуцкім праектам «Моладзь як суб'ект і аб'ект сацыяльна-палітычнай трансфармацыі грамадства» (навуковы кіраўнік — доктар філасофскіх навук, загадчык кафедры Ч.С.Кірвель), міжнародным праектам «Спектраскапічныя метады з выкарыстаннем тонкіх срэбных і залатых плёнак да біямедыцынскіх даследаванняў» (навуковы кіраўнік — доктар фізіка-матэматычных навук, С.А. Маскевіч), міжнародным праектам «Стварэнне бізнес-магістратуры ў ГрДУ імя Янкі Купалы» сумесна з Універсітэтам Бафала, Рыжскай школай бізнесу і Універсітэтам Ніагара (навуковы кіраўнік — кандыдат эканамічных навук Лі Чон Ку). Распрацавана і накіравана на экспертызу ў ДКНТ рэгіянальная навукова-тэхнічная праграма. На 1-ым годзе навучання ў аспірантуры абараніў кандыдацкую дысертацыю С.Л. Сабалеўскі (навуковы кіраўнік — доктар фізіка-матэматычных навук І.П.Мартынаў), які на сённяшні дзень з'яўляецца самым маладым кандыдатам навук у рэспубліцы. Усяго ў 1999 годзе падчас вучобы ў аспірантуры абараніліся 4 аспіранты (навуковыя кіраўнікі Г.А.Зорын, І.П.Крэнь, І.П.Мартынаў, А.В.Дулаў) (1998 — 1 чал.). Распачата мэтанакіраваная праца па фарміраванню навуковага патэнцыялу за кошт пазабюджэтных сродкаў універсітэта (4461,4 млн. руб.). Створаны 3 навукова-даследчыя лабараторыі. Распачаты і паспяхова працягваецца выпуск навукова-тэарэтычнага часопіса «Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы», павышаны статус навукова-метадычнага часопіса «Альфа».

Кафедрамі, факультэтамі надавалася адпаведная ўвага арганізацыі навуковых даследаванняў студэнтаў. У 1999 годзе абаронена 1145 дыпломных работ. Па выніках Рэспубліканскага конкурсу атрымана 27 дыпломаў, з іх І катэгорыі — 8 з 40 накіраваных на конкурс работ. Студэнтамі асобна і ў сааўтарстве з выкладчыкамі апублікаваны 110 навуковых работ. У выкананні даследаванняў з аплатай прынялі ўдзел 85 студэнтаў. Працавалі 2 навукова-даследчых студэнцкіх лабараторыі, 12 навуковых гурткоў.

Аднак па-ранейшаму застаўся не вырашаным шэраг праблем як у самой навуковай дзейнасці, так і ў яе арганізацыі.

Патрабуюць карэктыроўкі прыярытэтныя напрамкі навуковых даследаванняў універсітэта. Патрэбна вызначыць прыярытэтныя напрамкі навуковых даследаванняў на ўзроўні структурных падраздзяленняў (факультэтаў, кафедр). Па-ранейшаму застаюцца не зусім дасканалымі крытэрыі ацэнкі вынікаў навуковай дзейнасці. Нягледзячы на некаторыя станоўчыя тэндэнцыі, застаецца нізкай эфектыўнасць працы аспірантуры універсітэта. Толькі 37% аспірантаў, якія скончылі аспірантуру ў 1991-1996 гадах, абараніліся на працягу трох гадоў пасля завяршэння вучобы. Патрабуе ўдасканалення на базе новых стандартаў сістэма навучальна-даследчай і навукова-даследчай працы студэнтаў, работа па інфармацыйным забеспячэнні.

# ДЗЕНЬ БІБЛІЯТЭКІ

**«Ни один университет не может существовать без библиотеки, и если университет даже погибнет, а библиотека уцелеет, то это важнейшая из гарантий, что учебное заведение может возродиться»**

***Д.С.ЛИХАЧЕВ.***



У Рэспубліцы Беларусь становіцца традыцыяй адзначаць 16 чэрвеня, у дзень утварэння Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі, Дзень бібліятэкі. Свята толькі-толькі нараджаецца, але адчуваецца, што яно патрэбна не толькі для таго, каб падвесці пэўныя вынікі, кансалідаваць бібліятэчных работнікаў. Гэтае свята дапаможа ўмацаваць аўтарытэт бібліятэчнай асацыяцыі, якая павінна стаць сапраўдным прафесійным саюзам, здольным зрабіць працу бібліятэчных работнікаў больш творчай і цікавай, павысіць іх сацыяльны статус у грамадстве.



Адзначаў сваё свята і калектыў навуковай бібліятэкі універсітэта. Забягаючы наперад, хочацца сказаць, што свята атрымалася прыгожым, вясёлым і дасціпным. Калектыў падрыхтаваў шмат кніжных выстаў па самых розных тэматыках. Вось толькі некаторыя іх назвы: «Так пачыналася бібліятэка», «Жамчужына бібліятэкі» (з фонду рэдкіх выданняў), «Новыя кнігі». Выставы, альбомы з гісторыі ўтварэння бібліятэкі можна было ўбачыць не толькі ў галоўным корпусе, але і ў кожным філіяле.

Урачыстае пасяджэнне адкрыў дырэктар бібліятэкі Г.В.Данілаў.

Ва ўрачыстасцях, прысвечаных Дню бібліятэкі, прыняў удзел першы прарэктар па навучальна-выхаваўчай працы і сацыяльных пытаннях, прафесар І.П.Мартынаў. Ён сардэчна павіншаваў калектыў з прафесійным святам.

Бібліятэка адыгрывае вельмі важную ролю ў навучальным працэсе, — сказаў І.П.Мартынаў. — Сёння яна налічвае каля 600 тысяч экзэмпляраў. А пасля вайны было ўсяго 52 кнігі. Цяпер бібліятэка абслугоўвае 11 тысяч чытачоў...

Затым І.П.Мартынаў уручыў лісты ўдзячнасці ветэранам бібліятэкі.

З дакладам выступіла намеснік дырэктара бібліятэкі В.С.Гецолд.

— Для калектыву нашай бібліятэкі, — сказала яна, — гэтае свята — асаблівае, бо праводзіцца ў год 60-годдзя універсітэта. Гісторыя нашай бібліятэкі вельмі багатая, яна цесна звязана з гісторыяй прынёманскага краю.



Далей Валянціна Станіславаўна расказала аб асноўных этапах развіцця і станаўлення бібліятэкі, назвала прозвішчы тых, хто стаяў ля вытокаў бібліятэчнай справы. Дарэчы, у зале прысутнічалі ветэраны з ліку першых супрацоўнікаў бібліятэкі. Гэта — С.А.Памеранц, Г.М.Таюрская, Т.У.Мельнічонак, Г.М.Папова, А.Р. Корчыц, Е.Я. Трусава.



Затым выступіў намеснік дырэктара бібліятэкі В.С.Станкевіч.

На адным дыханні прайшлі ўрачыстасці, прысвечаныя Дню бібліятэкі. Тут было ўсё: і ўшанаванне ветэранаў з уручэннем сувеніраў, і іх успаміны, і прысвячэнне маладых калег у бібліятэкары (таксама з уручэннем жартоўных сувеніраў), і падвядзенне вынікаў конкурсаў у намінацыях «Міс ветлівасць», «Міс элегантнасць» і інш.

Прыемна было бачыць пасвятлеўшыя твары гаспадынь кніжнага царства — тых, хто пранёс вернасць прафесіі бібліятэкара праз гады — прафесіі нялёгкай і, згадзіцеся, ва ўсе часы — з невысокім заробкам. Побач з ветэранамі-пенсіянерамі — ветэраны, сённяшні касцяк бібліятэкі — Ф.С.Ляльчук, А.Д.Сямёнава, Б.К.Дз'ячкова, Л.І.Кебаў, З.Ц.Кавалеўская, Г.М.Мінішава, І.К.Малыгіна. — І маладзейшае пакаленне — Г.Д.Красоўская, Л.А.Лішчук, Г.М.Бырда, Л.Ф. Ганчарова, і — маладыя, выпускнікі бібліятэчнага факультэта 90-х гадоў — В.С.Гецолд, І.І.Селюжыцкая, Л.І.Лімар, А.У.Башуева, В.А.Глінская, А.Л.Масюк. Адчуваецца пераемнасць пакаленняў, узаемавыручка ў калектыве. Відаць, і гэта дапамагае нашай бібліятэцы быць у ліку перадавых сярод бібліятэк ВНУ рэспублікі, ды і за яе межамі.

Адметнай рысай сённяшняй бібліятэкі з'яўляецца ўкараненне ў практыку работы інфармацыйных тэхналогій. Поўнасцю аўтаматызаваны працэс апрацоўкі літаратуры, створаны электронны каталог, у якім — больш за 52 тысячы апісанняў. А сёння калектыў з дапамогай супрацоўнікаў вылічальнага цэнтра засвойвае бяскрайнія прасторы Інтэрнэта, прыступае да рэалізацыі новай праграмы далейшага развіцця бібліятэкі.

Сёння калектыў бібліятэкі налічвае 40 чалавек. У асноўным гэта людзі, якія добра ведаюць сваю работу, энтузіясты бібліятэчнай справы, і прафесійнае свята, якое адзначалася ўпершыню, атрымалася. Адчувалася, што ў калектыве пануюць добры маральна-псіхалагічны клімат, добры настрой і ўпэўненасць у заўтрашнім дні.

**Людміла ДАНІЛАВА,**
**Ігар ЯРАШЭВІЧ (фота).**

# ПАВЫШАЦЬ ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ РАБОТЫ

## АБ ВЫНІКАХ ДЗЕЙНАСЦІ УНІВЕРСІТЭТА Ў 1999/2000 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ І ЗАДАЧАХ НА 2000/2001 ГОД

### З ДАКЛАДА РЭКТАРА УНІВЕРСІТЭТА ПРАФЕСАРА С.А.МАСКЕВІЧА НА ПАСЯДЖЭННІ САВЕТА УНІВЕРСІТЭТА 30 ЧЭРВЕНЯ 2000 ГОДА

#### ВЫНІКІ РАБОТЫ

Мы пражылі незвычайны год: гэта быў год 60-гадовага юбілею нашай Alma mater, які дазволіў асэнсаваць пройдзены шлях і ўсвядоміць місію універсітэта у рэаліях сённяшняга дня. І гэта было вельмі своечасовым, паколькі на падставе такой рэфлексіі магчыма далейшае развіццё нашай навучальнай установы.

Аналізуючы развіццё нашага універсітэта, можна канстатаваць, што сёння ён праходзіць этап свайго станаўлення як універсітэт класічнага тыпу. На гэтай падставе ў якасці стратэгічных кірункаў саваёй дзейнасці універсітэт вызначае перш за ўсё падрыхтоўку кадраў па шэрагу спецыяльнасцей, як традыцыйных, так і запатрабаваных рэаліямі актуальнай сацыяльна-эканамічнай сітуацыі, а таксама рэалізацыю функцый даследчага цэнтра па асноўных кірунках гэтай падрыхтоўкі. У такой стратэгіі праз прыняцце канкрэтных задач універсітэт імкнецца да таго, каб працаваць не ва ўласнай субкультуры, а практычна ўзаемадзейнічаць з інфраструктурамі Гродзенскага рэгіёну - інфармацыйнай, эканамічнай, культурнай, сацыяльнай і іншымі.

Сярод найвастрэйшых праблем сённяшняга дня вылучаецца праблема недастатковага бюджэтнага фінансавання, неабходнага для рашэння нашых надзённых задач. Такая сітуацыя характэрная для навучальных устаноў большасці краін Еўропы. Але навучальныя ўстановы замежжа знаходзяць выхад шляхам прыцягнення спонсарскіх і іншых сродкаў. Так, да прыкладу, ва універсітэце Беластока (Рэспубліка Польшча) грунтоўная фінансавая і маральная падтрымка ажыццяўляецца па лініі такой недзяржаўнай арганізацыі, як Грамадзянскі камітэт па справах універсітэта ў Беластоку. На жаль, грамадская свядомасць у Рэспубліцы Беларусь, і ў асаблівасці ў рэгіёнах, у сілу аб'ектыўных і суб'ектыўных прычын не гатовая да таго, каб аказаць універсітэту значную дапамогу, і нам самім прыходзіцца шукаць выхад у сённяшняй нялрostай эканамічнай сітуацыі.

Дзеля праўды варта адзначыць, што тут многае залежыць і ад нашага «сустрэчнага руху». Пра гэта сведчыць вопыт правядзення намі юбілейных урачыстасцей. Спонсарскую дапамогу універсітэту і віншаванні даслалі больш за 70 арганізацый і ўстаноў.

Калісьці Гётэ сказаў: «Гавораць, што лічбы кіруюць светам: няма сумненняў у тым, што лічбы паказваюць, як ён кіруецца».

Побач з сённяшняй агульнай сітуацыяй развіцця адукацыі ў краіне, якая задаецца макрасацыяльнымі эканамічнымі рэаліямі і нацыянальна-гістарычнымі традыцыямі, у кожнай рэгіянальнай навучальнай установе ўласная ўнікальна-непаўторная сітуацыя развіцця.

Рэалізуючы гэтыя магчымасці ў нашым універсітэце, мы зыходзім з таго, што ў адукацыйным працэсе ажыццяўляецца самая працаёмкая, самая складаная «вытворчасць» - фармаванне асобы чалавека ў працэсе адкрыцця ім суб'ектыўна і аб'ектыўна новых ведаў. Гэта і ўяўляе сабою асноўную мэту і галоўны вынік гэтага працэсу.

Паспяховая рэалізацыя гэтай мэтавай установкі адукацыі ўяўляецца магчымай пры ўмове канструявання адукацыйнага працэсу на падставе такіх падыходаў, як улік і ўзгадненне ў адукацыйнай палітыцы інтарэсаў асобы і грамадства, у тым ліку рэальных інтарэсаў рэгіёну навучальнай установы; забеспячэнне фундаменталізацыі, гуманізацыі і гуманітарызацыі адукацыі; стварэнне адукацыйна-прафесійных праграм, якія забяспечваюць сістэмы неперарыўнай і шматузроўневай адукацыі; укараненне ў навучальны працэс новых тэхналогій. Спынімся толькі на некаторых момантах.

Найважнейшай сацыяльна значнай знешняй функцыяй універсітэта з'яўляецца падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў. Універсітэт паспяхова рэалізуе яе ва ўмовах рэальнай канкурэнцыі з іншымі, у тым ліку камерцыйнымі навучальнымі ўстановамі па шэрагу спецыяльнасцей. Гэты момант улічваецца ў арганізацыі прафарыентацыйнай работы ў школах горада і вобласці кафедрамі і прыёмнай камісіяй універсітэта. У мінулым годзе вынікам такой работы стаў даволі значны конкурс. Так, у ходзе кампаніі па наборы абітурыентаў на дзённым аддзяленні на бясплатную форму навучання пры плане прыёму ў 900 чалавек былі пададзены 1936 заяў: гэта дало агульны конкурс 2,15 чалавекі на месца.

Трэба адзначыць, што рэзка павысіўся конкурс на такія спецыяльнасці, як прыборабудаванне ( з 1,28 у 1998 да 1,075 у 1999 годзе) і прыкладная матэматыка - з 1,95 да 3. Што тычыцца конкурсу на іншыя спецыяльнасці, то ён за апошнія гады з'яўляецца больш-менш стабільным.

На наш погляд, паказчыкі конкурсу сведчаць пра тое, што наш універсітэт успрымаецца як навучальная ўстанова, якая працуе стабільна і гарантуе атрыманне вышэйшай адукацыі па сучасных спецыяльнасцях на сучасным узроўні.

Павышэнню ўзроўню арганізацыі навучальнага працэсу і якасці адукацыі ва універсітэце традыцыйна надаецца вялікая ўвага.

На сённяшні дзень навучальны працэс забяспечваюць 10 факультэтаў. Гуманітарны факультэт узнавіў работу з 1 верасня 1999 г. у сувязі з пераводам у нашу навучальную ўстанову студэнтаў з Гродзенскага філіяла Інстытута сучасных ведаў.

У студзені 2000 г. створана аб'яднанне кафедраў сацыяльна-гуманітарных навук, якое павінна забяспечыць эфектыўнае спалучэнне навуковых дасягненняў выкладчыкаў кафедраў з патрабаваннямі навучальнага працэсу пры падрыхтоўцы студэнтаў па культуралогіі, філасофіі, паліталогіі, сацыялогіі і іншых дысцыплінах. З 1 ліпеня пачне адлічваць самастойныя крокі факультэт псіхалогіі.

65 кафедраў ажыццяўляюць навучальны працэс па 5 профілях падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі, пры гэтым пералік профіляў і колькасць спецыяльнасцей у межах кожнага з іх сведчаць пра тое, што наш універсітэт сапраўды з'яўляецца рэгіянальным універсітэтам класічнага тыпу.

Так, на 7 спецыяльнасцях навуковага профілю навучаюцца 1502 студэнты; на 4 спецыяльнасцях эканамічнага профілю - 1042 чалавекі; на 9 спецыяльнасцях гуманітарнага профілю - 4167 чалавек; на 7 спецыяльнасцях тэхнічнага профілю - 395 чалавек і на 9 спецыяльнасцях педагагічнага профілю - 2109 чалавек.

Ажыццяўляць практычную падрыхтоўку студэнтаў па спецыяльнасцях, а таксама прыцягваць іх да навуковага пошуку дапамагаюць 49 навучальных лабараторый, якія з'яўляюцца базай для правядзення лабараторных і практычных заняткаў.

Ва універсітэце практычна на ўсіх факультэтах апрабаваны сістэмы рознаўзроўневай падрыхтоўкі спецыялістаў. Прадугледжаны такія ўзроўні адукацыі, як спецыяліст з вышэйшай адукацыяй, бакалаўр, магістр.

Па стане на чэрвень 2000 года ўсяго навучаюцца 9216 чалавек, з іх на дзённай форме навучання - 5937 студэнтаў, на вячэрняй - 75, на завочнай - 3204. Нягледзячы на складаныя ўмовы, універсітэт максімальна забяспечвае магчымасць атрымаць вышэйшую адукацыю ўсім маладым людзям, якія гэтага жадаюць. Для гэтага існуюць як бюджэтнае фінансаванне навучання, так і розныя формы навучання на ўмовах аплаты. З 9216 студэнтаў на ўмовах дагавору навучаюцца 3566 чалавек.

У 1999/2000 н.г. распачалася інавацыйная праца па арганізацыі новай формы навучання, якая з'яўляецца ўнікальнай на сённяшні дзень не толькі ў гродзенскім рэгіёне, але і наогул у Рэспубліцы Беларусь. Так, з 1 верасня 1999 года па чатырох спецыяльнасцях праведзены набор студэнтаў на завочную форму навучання фізіка-тэхнічнага факультэта на падставе дагавору аб сумеснай падрыхтоўцы спецыялістаў Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам імя Янкі Купалы і Полацкім дзяржаўным універсітэтам. Сведчаннем зацікаўленасці прадпрыемстваў вобласці ў спецыялістах з'яўляецца тое, што аплату навучання 46 чалавек з 66 узялі на сябе прадпрыемствы вобласці. Плануецца, што такі від падрыхтоўкі спецыялістаў дазволіць павысіць якасць іх ведаў шляхам рацыянальнай арганізацыі навучальнага працэсу, эфектыўнага выкарыстання матэрыяльна-тэхнічнай базы і кадравага патэнцыялу вышэйшых навучальных устаноў і прадпрыемстваў. Практыку арганізацыі інтэграванай падрыхтоўкі студэнтаў плануецца працягваць. У наступным годзе адбудзецца прыём яшчэ па 4-х спецыяльнасцях сумесна з Магілёўскім тэхналагічным інстытутам і дзвюх - з Брэсцкім універсітэтам.

Пасляінстытуцкая адукацыя спецыялістаў рэгіёну ва ўмовах зніжэння дзяржаўнага фінансавання вышэйшай школы запатрабавала стварэння гаспадарчаразліковых структур, якія працуюць згодна з прынцыпам самаакупнасці. Адной з такіх структур з устойлівым функцыянаваннем стаў створаны пры нашым універсітэце Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў. Тут на базе першай вышэйшай або сярэдняй спецыяльнай адукацыі любы чалавек за параўнальна невысокую плату можа атрымаць абраную прафесію ці павысіць сваю кваліфікацыю ў вобласці ўжо набытай прафесійнай адукацыі.

У 1999/2000 навучальным годзе ў Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў пры Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы быў арганізаваны навучальны працэс па наступных кірунках: перападрыхтоўка, першая вышэйшая адукацыя на базе сярэдняй спецыяльнай, кароткатэрміновыя адукацыйныя курсы, курсы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі спецыялістаў, арганізацыі семінараў.

З узнаўленнем у гэтым годзе гуманітарнага факультэта універсітэт узяў на сябе абавязак рыхтаваць спецыялістаў па новых для сябе спецыяльнасцях (у прыватнасці - «Фінансы і крэдыт»). Праўда, адкрыццё такой спецыяльнасці адбудзецца з 2000/2001 навучальнага года і на факультэце эканомікі і кіравання па дзённай і завочнай формах навучання.

Акрамя названай, плануецца адкрыць і іншыя новыя спецыяльнасці, вельмі неабходныя рэгіёну, - «Сацыяльная педагогіка», «Педагогіка і методыка пачатковага навучання» з дадатковай спецыяльнасцю «Англійская мова», «Дэфекталогія». Увогуле на 2000/2001 навучальны год універсітэт аб'явіў прыём на першы курс па сарака дзвюх спецыяльнасцях.

У мінулым навучальным годзе адбыўся першы выпуск па спецыяльнасцях «Класічныя мовы і антычная літаратура», «Руская мова і літаратура» са спецыялізацыямі «Рыторыка» і «Руская мова як замежная», «Псіхалогія», а таксама ўпершыню універсітэт падрыхтаваў настаўнікаў і рэферэнтаў-перакладчыкаў з веданнем дзвюх замежных моў. У гэтым навучальным годзе адначасова выпуск студэнтаў па спецыяльнасці «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій».

Неабходна адзначыць, што ў гэтым годзе дыпломы нашага універсітэта атрымаюць 1280 маладых людзей, у тым ліку дыпломы з адзнакай - 154 .

Якасная падрыхтоўка спецыялістаў, безумоўна, немагчымая без аб'яднання навукі і навучання ў навучальным працэсе.

У 1999 годзе найбольш эфектыўна вынікі навукова-даследчай працы выкарыстоўваліся ў навучальным працэсе на фізіка-тэхнічным факультэце. З сарака дзвюх навукова-даследчых прац укаранёна ў навучальны працэс 11. Усяго на гэтым факультэце выкарыстана 29 распрацовак у навучальных курсах, спецкурсах, падчас дыпломнага і курсавога праектавання.

Важнае значэнне ў павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў сёння мае выкарыстанне ў навучальным працэсе камп'ютарнай тэхнікі.

Ва універсітэце на працягу года ішла праца па ўкараненні ў навучальны працэс новых падыходаў, арыентаваных на выкарыстанне магчымасцей вылічальнай тэхнікі і камп'ютарных сетак рознага ўзроўню. У межах выканання тэмы «Развіццё інфармацыйнай структуры матэматычнага факультэта на аснове камп'ютарных сетак» была прапанавана і часткова рэалізавана канцэпцыя віртуальнага класа для правядзення лабараторных заняткаў па практыкуме на ЭВМ і вылічальнай практыцы на факультэтах з паглыбленым вывучэннем інфарматыкі.

Аднак, нягледзячы на значныя поспехі кафедраў, факультэтаў і ў цэлым універсітэта ў арганізацыі навучальнага працэсу, застаецца нявырашаным шэраг праблем. Сёння нас не можа задаволіць узровень ведаў нашых студэнтаў, а гэта значыць - узровень падрыхтоўкі спецыялістаў па шэрагу спецыяльнасцей.

## УНУТРАНАЯ АТЭСТАЦЫЯ

Вынікі атэстацыі сведчаць пра тое, што на асобных факультэтах ёсць неабходнасць прыняць неадкладныя меры для паляпшэння становішча.

Неабходна адзначыць, што самым сур'ёзным чынам паставіліся да выканання загаду рэктара №165 ад 22 сакавіка 2000 года дэканаты факультэтаў эканомікі і кіравання, біялогіі і экалогіі, матэматычнага, гісторыі і культуры. Імі былі праведзены сходы студэнтаў, дадатковыя кансультацыі, прааналізаваны стан наведвання студэнтамі навучальных заняткаў, праведзена дадатковае растлумачэнне неабходнасці і мэтазгоднасці гэтых кантрольных работ напярэдадні атэстацыі.

Як ужо адзначалася вышэй, стварэнне класічнага універсітэта немагчымае без развіцця навуковых даследаванняў і прыцягнення да іх студэнтаў. Сёння навуковыя даследаванні ва універсітэце фінансуюцца за кошт Міністэрства адукацыі Беларусі, галіновых міністэрстваў, грантаў міжнародных арганізацый і саветаў, уласных сродкаў, якія універсітэт атрымлівае за кошт платных адукацыйных паслуг. Эфектыўнымі сродкамі стымулявання навуковай працы выкладчыкаў і студэнтаў сталі такія, як вылучэнне Саветам універсітэта грантаў для падрыхтоўкі доктарскіх дысертацый, арыентацыя на пастаянныя і часовыя навуковыя калектывы, правядзенне конкурсаў на лепшую кафедру і лепшага супрацоўніка па выніках навукова-даследчай працы за канкрэтны каляндарны год. Асобным студэнтам, якія праяўляюць здольнасці і цікавасць да навукова-даследчай працы, даецца магчымасць навучання па індывідуальным плане, а таксама магчымасць закончыць універсітэт экстэрнам.

Важна адзначыць, што 1999 год быў першым годам, калі калектыў універсітэта працаваў у рамках рэалізацыі Канцэпцыі развіцця навукі ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце на перыяд да 2005 года.

Аналіз знешняга і ўнутранага асяроддзя, у якім развіваецца навуковая дзейнасць універсітэта, паказвае правамернасць закладзеных у аснову Канцэпцыі пасылак і правільнасць абраных кірункаў навуковай дзейнасці. Спецыфіка яе заключаецца ў адпаведнасці навуковых кірункаў профілю падрыхтоўкі спецыялістаў.

Аднак неабходна адзначыць, што да гэтага часу канцэпцыя не «падтрымана» адпаведнай нарматыўнай базай, што, безумоўна, абцяжарвае яе рэалізацыю.

У мінулым годзе асноўная ўвага ў галіне навуковай дзейнасці была звернута на развіццё навукова-педагагічнага патэнцыялу універсітэта і падрыхтоўку спрыяльных умоваў для развіцця навукова-вытворчай дзейнасці.

Адзначым асноўныя вынікі. У 1999 годзе універсітэт упершыню ў гісторыі Рэспублікі Беларусь як рэгіянальная навучальная ўстанова ўзначаліў міжінстытуцкую праграму «Дынамічныя сістэмы» (навуковы кіраўнік Мінюк С.А.). Распачата праца над комплексным міжінстытуцкім праектам «Моладзь як суб'ект і аб'ект сацыяльна-палітычнай трансфармацыі грамадства» (навуковы кіраўнік Кірвель Ч.С.), міжнародным праектам «Спектраскапічныя метады з выкарыстаннем тонкіх сярэбраных і залатых плёнак для біямедыцынскіх даследаванняў» сумесна з Рэймскім універсітэтам (Францыя) і Інстытутам біяарганічнай хіміі Расійскай Акадэміі навук (навуковы кіраўнік Маскевіч С.А.), міжнародным праектам «Стварэнне бізнес-магістратуры» ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы сумесна з універсітэтам Бафала і Рыжскай школай бізнесу (навуковы кіраўнік Лі Чон Ку).

На працягу першага года навучання ў аспірантуры абараніў кандыдацкую дысертацыю аспірант Сабалеўскі С.Л. (навуковы кіраўнік Мартынаў І.П.), які на той момант з'яўляўся самым маладым кандыдатам навук у рэспубліцы. Усяго ў 1999 годзе ў час навучання ў аспірантуры абараніліся 4 аспіранты.

У 2000 годзе найбольш паспяхова абараняюцца аспіранты, якімі кіруе дацэнт Коўкель Іван Іванавіч (3 абароны на працягу першага паўгоддзя).

Падрыхтоўка кадраў найвышэйшай кваліфікацыі вялася ў 1999/2000 навучальным годзе ў магістратуры па 18 спецыяльнасцях (у 1998 - па 13), у аспірантуры - па 34 спецыяльнасцях (у 1998 - па 34), а таксама ў рамках 3 грантаў для завяршэння доктарскіх дысертацый (у 1998 - 1 ).

## ВЫНІКОВАСЦЬ НДП

У 1999 годзе абаронена 35 магістарскіх, 20 кандыдацкіх і 2 доктарскія дысертацыі (у 1998 - 14; 15 і 3 адпаведна). За першую палову 2000 года: 6 кандыдацкіх, 1 доктарская дысертацыя. Паспяхова ішла праца 3 Саветаў па абароне кандыдацкіх дысертацый. У 1999 годзе абаронена 12 дысертацый (у 1998 - 1). У першай палове 2000 года - 4 дысертацыі.

Асобна скажам некалькі слоў аб фінансаванні навуковых даследаванняў за кошт унутраных сродкаў універсітэта. Дадаткова да 21 тэмы створаны 3 навукова-даследчыя лабараторыі, у 2000 годзе плануецца адкрыццё яшчэ дзвюх лабараторый. Фінансаванне даследаванняў за кошт унутраных сродкаў універсітэта ў 1999 годзе склала чатыры мільёны чатырыста шэсцьдзесят адну тысячу чатырыста дэнамінаваных рублёў, у 2000 годзе плануецца трынаццаць мільёнаў сто дзевяноста пяць тысяч рублёў.

Навукова-даследчаму сектару належыць сумесна з навучальна-метадычным аддзелам абнавіць наяўную нарматыўную базу, якая рэгулюе правядзенне конкурсаў і экспертызу праектаў, надаўшы асаблівую ўвагу іх эфектыўнасці.

У адпаведнасці з зацверджанай канцэпцыяй вялікую ўвагу

трэба надаць пошукавым і прыкладным даследаванням, якія садзейнічаюць пераўтварэнню навуковых ведаў у тавар, а фундаментальныя даследаванні падлягаюць падтрымцы ў выпадку, калі маецца прыярытэт у рэспубліцы і за мяжой.

З мэтай актывізацыі навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці мэтазгодна стварэнне спецыяльнага фонду, з якога універсітэт мог бы на беспрацэнтнай аснове крэдытаваць самаакупныя праекты, якія прапануюцца навуковымі і творчымі калектывамі. Палажэнне аб такім фондзе да канца 2000 года неабходна падрыхтаваць навукова-даследчаму сектару сумесна з планава-эканамічным аддзелам універсітэта.

Паказчыкі выніковасці навуковых даследаванняў сведчаць аб дадатнай дынаміцы развіцця навукі.

У цэлым па выніках навуковых даследаванняў у 1999 годзе апублікавана 1355 (адна тысяча трыста пяцьдзесят пяць) прац, у тым ліку 16 (шаснаццаць) манаграфій, 7 падручнікаў і 40 (сорак) навучальных дапаможнікаў, з іх 5 падручнікаў і 3 навучальныя дапаможнікі з грыфам Міністэрства адукацыі; 962 артыкулы, у тым ліку 217 - у перыядычных часопісах. Для параўнання: у 1998 годзе адпаведна 1268 прац, у тым ліку 7 манаграфій, 6 падручнікаў і 41 навучальны дапаможнік, з іх з грыфам Міністэрства адукацыі - 3 падручнікі і 5 дапаможнікаў; артыкулаў - 898, з іх у перыядычных часопісах - 153.

Канцэпцыяй развіцця навукі падкрэсліваецца асобны статус універсітэта як навуковага цэнтра рэгіёну. Ці ў поўнай меры адпавядае універсітэт на сённяшні дзень гэтаму статусу? І так, і не! Відавочна толькі адно: што прастор для рэалізацыі вышэйназванага статусу вельмі шырокі. І універсітэтам як цэнтрам праектавання рэгіянальнай навукова-тэхнічнай палітыкі зроблены першыя крокі. Ён стаў галаўной арганізацыяй па распрацоўцы рэгіянальнай навукова-тэхнічнай праграмы, а таксама па распрацоўцы прагнозу навукова-тэхнічнага развіцця вобласці на перыяд да 2020 года.

Аднак побач з усім станоўчым варта адзначыць, што гэты вынік атрыманы дзякуючы мэтанакіраванай працы толькі асобных кафедраў, навуковых кіраўнікоў, а таксама рэктарата.

Усё больш значным становіцца ўплыў універсітэта на сістэму адукацыі горада і вобласці. Выкладчыкі універсітэта актыўна супрацоўнічаюць з навучальнымі ўстановамі новага тыпу. У 1998/1999 гадах універсітэтам падрыхтаваны 12 падручнікаў і дапаможнікаў для школ, ліцэяў, гімназій.

### ЗАМЕЖНЫЯ СУВЯЗІ

Вельмі важным аспектам дзейнасці універсітэта з'яўляецца міжнароднае супрацоўніцтва, якое забяспечвае яго інтэграцыю ў сусветнае адукацыйнае і навуковае супрацоўніцтва.

Для пашырэння міжнароднай дзейнасці Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы штогод заключае дагаворы аб супрацоўніцтве і працягвае працу ў рамках дагавораў аб супрацоўніцтве з замежнымі навучальнымі ўстановамі і іншымі партнёрскімі арганізацыямі. Варта адзначыць дагавор з Маскоўскім дзяржаўным універсітэтам і Універсітэтам Беластока.

Наш універсітэт у 1999 годзе правёў 26 рабочых сустрэч у рамках дагавораў аб супрацоўніцтве, заключаных з навучальнымі ўстановамі далёкага і блізкага замежжа. Найбольшая колькасць дэлегацый была накіравана ў Рэспубліку Польшча (18). Сярод навучальных установаў Расійскай Федэрацыі найбольш шчыльныя кантакты наладжаны з Санкт-Пецярбургскім дзяржаўным універсітэтам і Маскоўскім дзяржаўным універсітэтам імя М.В.Ламаносава.

У 1999 годзе Гродзенскі дзяржаўны універсітэт браў удзел у 6 міжнародных праектах, агульны бюджэт якіх складае больш за паўтара мільёна долараў ЗША.

Адной з формаў арганізацыі міжнародных кантактаў у навукова-адукацыйнай сферы, азнаямлення з навуковымі дасягненнямі, рашэння канкрэтных навукова-педагагічных праблем з'яўляюцца арганізацыя і правядзенне міжнародных канферэнцый, семінараў, выстаў і іншых мерапрыемстваў.

У 1999 годзе ва універсітэце праведзена 7 міжнародных мерапрыемстваў.

Больш за 30 навуковых артыкулаў выйшлі ў часопісах, зборніках навуковых прац, матэрыялах канферэнцый.

Пазітыўны вынік для развіцця ВНУ мае навучанне ў ім замежных навучэнцаў на кантрактнай аснове і на аснове дзяржаўных і міжнародных пагадненняў.

У Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы навучаліся 70 студэнтаў з 9 краін, якія не з'яўляюцца грамадзянамі Беларусі.

12 выкладчыкаў, супрацоўнікаў і аспірантаў універсітэта прайшлі замежныя стажыроўкі ў ФРГ, Расіі, Польшчы, Італіі і ЗША.

Завяршаючы аналіз дзейнасці універсітэта ў галіне адукацыі і навукі, хацелася б асаблівую ўвагу звярнуць на тое, што ў палітыцы, якая праводзіцца намі ў гэтых кірунках, не могуць не ўлічвацца рэгіянальныя асаблівасці.

У гэтым плане відавочная неабходнасць і культурна-творчай дзейнасці універсітэта ў рэгіёне ў выглядзе публічных лекцый, мастацкіх выстаў, конкурсаў. Ужо сёння універсітэт аказвае актыўнае ўздзеянне на культурна-адукацыйную прастору рэгіёну шляхам яго інфармацыйнага забеспячэння і дзякуючы аддзяленню мастацтваў і ФГП. Так, універсітэцкая бібліятэка, якая налічвае 600 тысяч тамоў, фактычна працуе ў рэжыме публічнай бібліятэкі. Універсітэт атрымлівае выданні з-за мяжы, усталяваны інфармацыйны абмен з асобнымі ВНУ Расіі, Польшчы, Германіі, Італіі, ЗША і іншых краін. Разам з тым на гэтым кірунку дзейнасці універсітэт сустракае і цяжкасці. У прыватнасці, застаецца дастаткова складанай справа набыцця навуковай літаратуры за межамі Беларусі, хоць гэта і адбываецца ў асноўным за кошт пазабюджэтных даходаў універсітэта. Яшчэ большая цяжкасць звязана з адсутнасцю спецыяльнага бібліятэчнага комплексу з сучаснымі кнігасховішчамі і чытальнымі заламі, якія могуць абслугоўваць як выкладчыкаў і студэнтаў, так і жыхароў горада. Гэтае пытанне закладзена ў план працы Савета універсітэта.

### РАБОТА З КАДРАМІ

Вядомы расійскі акадэмік Мікіта Маісееў заўважыў, што той, хто перадае эстафету ведаў і культуры, пераўтвараецца ў цэнтральную фігуру грамадства гэтаксама, як і той, хто яе прымае. Відавочна, што галоўнымі суб'ектамі адукацыйнай дзейнасці з'яўляюцца выкладчыкі і студэнты.

У гэтай сувязі перш за ўсё хацелася б сказаць аб кадравай палітыцы, якая праводзіцца універсітэтам. Яе глыбінная сутнасць адлюстравана ў галоўным арганізацыйна-дзейнасным законе, адкрытым класікамі менеджменту, які сцвярджае: самае галоўнае ў рабоце з чалавечымі рэсурсамі - клопат і ўвага.

Так, напрыклад, усяго ў 1999 годзе павысілі сваю кваліфікацыю, прайшлі стажыроўку, перападрыхтоўку 102 чалавекі, у тым ліку 94 выкладчыкі, 8 супрацоўнікаў.

Аналіз выканання плана павышэння кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкага складу на 1999 год дазваляе зрабіць выснову, што ён выкананы на 102% (у 1998 годзе - на 102,3%.

Стратэгічная ўстаноўка кадравай палітыкі адміністрацыі заключалася ў забеспячэнні навучальна-выхаваўчага працэсу навукова-педагагічнымі кадрамі высокага ўзроўню кваліфікацыі.

Функцыянальнай структурай, якая забяспечвае гэты кірунак дзейнасці, з'яўляецца атэстацыйная і конкурсная камісія (старшыня - І.П. Мартынаў). У межах сваёй кампетэнцыі камісія адыгрывае актыўную ролю ў вызначэнні адпаведнасці паказчыкаў прэтэндэнта на вакантную пасаду патрабаванням адпаведных пунктаў Палажэння.

Важным аспектам дзейнасці камісіі з'яўляецца разгляд пытанняў, звязаных з прысваеннем вучоных званняў.

Усяго ў 1999/2000 навучальным годзе было разгледжана 14 атэстацыйных спраў, у тым ліку дзве - па прысваенні вучонага звання прафесара, 12 - па прысваенні вучонага звання дацэнта. Атэстацыя ажыццяўлялася на аснове аналізу паказчыкаў суіскальніка вучонага звання і ўстанаўлення іх адпаведнасці патрабаванням, вызначаным у Палажэнні.

Вынікі, атрыманыя ў выніку рэпрэзэнтатыўнага сацыялагічнага даследавання студэнтаў універсітэта, у тым ліку і выпускных курсаў, сведчаць, што для большасці студэнтаў выкладчык не з'яўляецца значным другім чалавекам, на ацэнку якога ў дачыненні сваіх учынкаў, паводзін яны зарыентаваны: 95% апытаных арыентуюцца на ацэнку сяброў і 89% - на ацэнку бацькоў.

Гэтыя вынікі сведчаць нам аб псіхалагічнай дыстанцыі паміж выкладчыкам і студэнтам, абумоўленай перавагай фармальна-дзелавых зносін над асобаснымі, што, безумоўна, зніжае выхаваўчую эфектыўнасць іх узаемадзеяння.

Вывучэнне каштоўнасных арыентацый нашых выпускнікоў паказала, што ў іх пераважаюць каштоўнасці, звязаныя з асабістым жыццём (95% рэспандэнтаў); з матэрыяльным дастаткам (83% рэспандэнтаў), і ярка выражана адмоўнае стаўленне да алкаголю і наркотыкаў. Разам з тым відавочная несфармаванасць каштоўнасных арыентацый шырокага сацыяльнага зместу, без якіх немагчыма фармаванне маладога чалавека як грамадзяніна і патрыёта. Невыпадковыя ў гэтай сувязі вынікі, якія сведчаць аб тым, што 63% пяцікурснікаў расцэньваюць свае ўласныя інтарэсы як больш важныя, чым інтарэсы дзяржавы. Як пазітыўны можна ацаніць той факт, што большая частка выпускнікоў пры гэтым зарыентаваны на рашэнні жыццёвых праблем за кошт уласных намаганняў, што сведчыць аб адсутнасці ў іх пасіўна-спажывецкіх установак паводзінаў у адносінах да дзяржавы, аднак жыццёвая актыўнасць мае эгацэнтрычную скіраванасць.

Хочацца коратка пракаментаваць і вынікі другога сацыялагічнага даследавання - «Вы-

кладчык вачыма студэнта». Яно дазволіла сфармаваць базу даных рэйтынгавых паказчыкаў выкладчыкаў ГрДУ. У ходзе даследавання былі апытаны 1650 студэнтаў, што дазволіла сфармаваць 66 груп па 12 выкладчыкаў.

Хацелася б адзначыць, што пры інтэрпрэтацыі атрыманых вынікаў неабходна ўлічваць, што гэты «люстраны» адбітак не ёсць абсалютная ацэнка дзейнасці выкладчыка, а толькі фіксацыя таго ўяўлення, якое сфарфавана ў выніку педагагічнай дзейнасці выкладчыка ў студэнта.

Размеркаванне адказаў адпавядае нармальнаму размеркаванню Гаўса.

Найвышэйшы бал (166-144) атрымалі 14 выкладчыкаў ВНУ, што склала 3,2% ад агульнага ліку разглядаемых выкладчыкаў.

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на колькасць выкладчыкаў, якія атрымалі нізкі і самы нізкі балы, іх доля ў агульнай выбарцы склала 4,1% (18 выкладчыкаў), але іх нізкія рэйтынгі якасных характарыстык сведчаць аб тым, што яны знаходзяцца на парозе, за межамі якога пачынаецца педагагічная непрафесійнасць. Таму трэба звярнуць іх увагу на неабходнасць авалодвання сучаснымі педагагічнымі тэхналогіямі.

Рэйтынгавыя паказчыкі даюць нам магчымасць ахарактарызаваць рэйтынгі кафедраў і адпаведна факультэтаў.

Тэндэнцыі рэйтынгавых паказчыкаў дазваляюць канстатаваць найвышэйшую і найніжэйшую ацэнку факультэтаў. Інтэрвал паміж рэйтынгамі факультэтаў склаў 18 балаў. На першых месцах факультэты: псіхалогіі і педагогікі; аб'яднанне кафедраў сацыяльна-гуманітарных навук. Апошнія месцы за факультэтамі: гісторыі і культуры; юрыдычным.

## МЭТАВЫЯ КОМПЛЕКСНЫЯ ПРАГРАМЫ

Была прапанавана пэўная мадэль гуманітарызацыі адукацыі, рэалізацыя якой дазволіла б сфармаваць фундамент далейшага ўдасканалення гэтага працэсу.

Так, у адпаведнасці з праграмай гуманізацыі і гуманітарызацыі адукацыі ў ГрДУ былі падрыхтаваны праграмы курсаў «Уводзіны ў гуманістыку», «Чалавеказнаўства», «Геапалітыка».

Першыя крокі ў рэалізацыі праграмы гуманітарызацыі адукацыі ў ГрДУ часцей за ўсё ўскладняюцца непрыняццем факультэтамі неабходнасці яе ўкаранення. Слабая арганізацыйная забяспечанасць выканання праграмы прыводзіць да таго, што часта факультэты проста ігнаруюць прадугледжаныя праграмай мерапрыемствы.

Вялікае значэнне надаецца сёння выкананню праграмы ўкаранення інфармацыйных тэхналогій.

Матэрыяльна-тэхнічная база інфармацыйных тэхналогій налічвае 470 камп'ютараў у 13 камп'ютарных класах, 6 лабараторыях (заканадаўства, псіхалогіі, навучальна-метадычнай на кафедры ІВТ, НДЛ інфармацыйных тэхналогій і сродкаў тэлекамунікацый, рэгіянальнай эканомікі, рэгіянальнай культуры) і 41 капіравальны апарат. Падключана да карпаратыўнай інфармацыйнай сеткі 385 камп'ютараў. Больш за 100 супрацоўнікаў, выкладчыкаў, студэнтаў, аспірантаў універсітэта карыстаюцца паслугамі электроннай пошты.

Толькі ў 1999/2000 навучальным годзе падключаны да ЛВС 91 камп'ютар, пушчаны ў эксплуатацыю ЛВС у корпусе па БЛК,5, на юрыдычным факультэце, гістарычным, біялагічным, на факультэце эканомікі і кіравання. Сумесна з цэнтрам тэлекамунікацый вышэйпералічаныя ЛВС карпусоў інтэграваны ў карпаратыўную інфармацыйную сетку.

У цэлым трэба сказаць, што наяўная матэрыяльна-тэхнічная база дазваляе больш паспяхова ўкараняць інфармацыйныя тэхналогіі ў навучальны працэс, навуку, у кіраванне універсітэтам, але для гэтага неабходна павышэнне кваліфікацыі ўсіх супрацоўнікаў і выкладчыкаў універсітэта, а таксама стварэнне сістэмы кіравання працэсамі ўкаранення інфармацыйных тэхналогій.

Для рэалізацыі функцыі кіравання неабходная інфармацыйна-кіраўнічая сістэма.

З мэтай аптымізацыі кіравання рэктарат плануе правесці значную рэарганізацыю агульнауніверсітэцкіх службаў і вынесці гэтае пытанне на Савет універсітэта ўжо ў верасні гэтага года.

Шэраг праграм быў зарыентаваны на вырашэнне сацыяльных пытанняў. Гэта перш за ўсё праграма «Жыллё», якая мае на мэце заахвочванне найбольш кваліфікаваных работнікаў, замацаванне маладых і запрошаных спецыялістаў.

## ЖЫЛЛЁ, БЫТ

Усяго універсітэтам аказана дапамога ў будаўніцтве жылля 45 работнікам. У значнай ступені з дапамогай Камісіі поўнасцю вырашаны пытанні жылля для 7 супрацоўнікаў універсітэта.

У галіне аховы здароўя выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў праведзена пэўная праца аддзелам аховы здароўя. Пастаўленая ў мінулыя гады перад аддзелам аховы здароўя мэта - каардынацыя лячэбна-прафілактычных і фізкультурна-аздараўленчых мерапрыемстваў, а таксама стварэнне неабходных умоў для абследавання і лячэння хворых студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта, захаванне здароўя здаровых - выконваецца паспяхова.

Хацелася б сказаць і пра ход рэалізацыі «Праграмы развіцця фізічнай культуры і спорту» ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы ў 1999-2000 навучальным годзе.

У 1999-2000 навучальным годзе забяспечана выкананне календара фізкультурна-масавых мерапрыемстваў. Праведзена спартакіяда універсітэта па 11 відах спорту. Зборныя каманды універсітэта ўзялі актыўны ўдзел у першынстве ВНУ РБ, гарадской спартакіядзе ВНУ. Па выніках гарадской спартакіяды каманда факультэта фізічнай культуры заняла першае месца, зборная каманда астатніх факультэтаў - трэцяе месца, прапусціўшы наперад толькі каманду вучылішча алімпійскага рэзерву.

Гонарам нашага калектыву трэба лічыць і тое, што ён не забывае пра сваіх ветэранаў. Так, за 1999-2000 навучальны год ветэраны універсітэта атрымалі значную матэрыяльную дапамогу з боку рэктарата і прафкома. 264 ветэраны атрымалі дапамогу ў 1999 годзе на суму 430 млн. рублёў і ў 2000 годзе - 320 тыс. рублёў.

Сацыяльнаарыентаваная дзейнасць адміністрацыі знаходзіла падтрымку і ажыццяўлялася ў шчыльным супрацоўніцтве з прафкомамі супрацоўнікаў і студэнтаў.

Ва універсітэце ў апошні час праведзена вялікая работа па развіцці сацыяльнага партнёрства паміж адміністрацыяй і прафкомам па пытаннях сацыяльнага жыцця. Можна смела сказаць, што склалася практыка дэмакратычнага прыняцця рашэнняў па асноўных пытаннях сацыяльнай сферы, якая абапіраецца на нашы рэальныя матэрыяльныя, працоўныя і фінансавыя магчымасці.

Распрацавана па многіх кірунках сацыяльнай сферы нарматыўна-прававая дакументацыя, што значна павышае прававыя гарантыі супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта.

Значна палепшылася на добрым арганізацыйным, мастацкім і выніковым узроўні правядзенне культурна-масавых, фізкультурна-аздараўленчых і спартыўных мерапрыемстваў. Удзельнічаючы ў розных конкурсах, фестывалях і спартыўных спаборніцтвах рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў, станавіліся лаўрэатамі і пераможцамі ансамбль «Капрыз», студэнцкі тэатр эстрадных мініяцюр, тэатр моды, фальклорны ансамбль «...ёна», каманды барцоў класічнага стылю, баскетбалістаў, валейбалістаў, легкаатлетаў. Каманда КВЗ універсітэта выйшла ў вышэйшую рэспубліканскую лігу і дастойна выступае ў ёй.

Патрэбна спыніцца і на адным з самых складаных пытанняў, эфектыўнасць вырашэння якога ў многім вызначае выніковасць розных аспектаў дзейнасці універсітэта. Гаворка ідзе пра матэрыяльна-тэхнічную базу універсітэта.

Па-ранейшаму востра адчуваецца недахоп аўдыторнага фонду.

Робяцца захады па яе ўмацаванні і пашырэнні. Вядзецца рэканструкцыя памяшканняў былога завода «Радыёпрыбор», трох памяшканняў былога паграпатрада, пятага паверху «Дома тэхнікі», што дазволіць істотна палепшыць умовы для арганізацыі навучальнага працэсу. Пастаянна вядуцца работы па бягучым і капітальным рамонце навучальных памяшканняў, інтэрнатаў.

Хацелася б сказаць і аб праблеме арганізацыі харчавання студэнтаў. Тут многае робіцца камбінатам грамадскага харчавання. Дзве сталоўкі, тры буфеты даюць магчымасць 65% студэнтаў карыстацца іх паслугамі.

Відавочна, што неабходна пашырыць сетку буфетаў у навучальных карпусах і інтэрнатах, адкрыць у горадзе студэнцкае кафэ. Праграма дзеянняў у гэтым кірунку была абмеркавана на пасяджэнні рэктарата.

## РАБОТА САВЕТА

У 1999/2000 навучальным годзе работа Савета універсітэта ажыццяўлялася ў адпаведнасці з зацверджаным планам. Усяго адбылося 11 пасяджэнняў Савета, на якіх па асноўным парадку дня было разгледжана 11 пытанняў, па раздзеле «Рознае» - 103 пытанні. Відавочная значная насычанасць раздзелу «Рознае»; пры гэтым у яго ўключаліся толькі тыя пытанні, якія ўваходзяць у кампетэнцыю Савета. У гэтай сувязі камісіяй Савета па прававых і сацыяльных пытаннях падрыхтаваны прапановы па дапаўненнях у рэгламент Савета ў дачыненні да працэдуры правядзення пытанняў гэтага раздзелу.

Гаворачы аб працы Савета, варта адзначыць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да пасяджэння і абмеркаванні пытанняў многіх членаў Савета, і перш за ўсё старшынь пастаянных камісій Савета: М.В.Жарскага, І.П. Мартынава, С.А.Мінюка, М.У.Сільчанкі, Я.У.Піульскага, Лі Чон Ку.



# МЫ БЫЛИ ПЕРВЫМИ

**Воспоминания первой заведующей библиотекой Софьи Абрамовны ПОМЕРАНЦ**

Август 1945 г. Недавно отгремел салют Победы. Гродно еще в руинах. Особенно его центр — Советская площадь и прилегающие к ней улицы. Дома-коробки. Еще не снята колючая проволока по ул. Замковой, где проходила граница еврейского гетто.

На улицах гражданского населения мало. Все больше людей в железнодорожной форме. В то время в Гродно находилось Управление железной дороги. Много военных.

А институт уже работал. С 1944 года начались здесь занятия — сразу после освобождения. Я принимала библиотеку от временно исполняющей обязанности заведующей библиотекой Нины Борисовны Бутылкиной. Работала она со студенткой литературного факультета Ниной Иосифовной Квартенок (ныне Киркевич), по 4 часа в день.

Библиотека института в то время помещалась на первом этаже в 12-й аудитории. Там же стояло несколько столов со стульями, которые одновременно служили и читальным залом. Книжный фонд тогда помещался в двух шкафах и на нескольких полках. И эти немногие книги институт получил в дар от библиотек страны из разных городов: Минска, Львова, Казани.

Первые работники библиотеки студентки Н.Бутылкина и Н.Квартенок завели первую толстенную книгу по инвентаризации библиотечного фонда и заказали печать библиотеки. Таким образом, каждая книга при поступлении получала порядковый номер и печать библиотеки института.

Бумагу, карточки, каталожные ящики негде было купить. Кое-чем помогла областная библиотека, в основном же пришлось использовать подручный материал.

Карточки устанавливались по буквенному распределению, по отделам. Так как я тоже не имела специального библиотечного образования, установленный Бутылкиной и Квартенок порядок продолжал функционировать еще много лет.

Впоследствии, по мере расширения книжного фонда и увеличения количества студентов по штатному расписанию утвердили трех работников: заведующего библиотекой и двух библиотекарей. В помощь нам дирекция института выделила лаборанта, который работал как библиотекарь. Помогала нам постоянная группа студентов-общественников в обработке книг — клеили кармашки, ярлычки, ставили печать.

Затем штат увеличился. Работали уже постоянные библиотекари Мира Иосифовна Столицкая, Галина Михайловна Попова. Позже пришли Майя Александровна Ковалева, Прасковья Ульяновна Мигурская и другие. С этим составом мы переводили весь книжный фонд по авторской таблице Хавкиной на единые правила по описанию книг и произведений печати для библиотечных каталогов. Студентки-библиотекари работали у нас на полставки до окончания ими института. Сейчас они — уважаемые «старые» преподаватели в школах Гродно и Гродненского района — Полякова, Купченок.

Помню, когда библиотека находилась в 12-й аудитории, на всю стену висел большой лозунг: «Учиться, учиться, и учиться» (Ленин). Тогда этот лозунг имел особый смысл.

Первыми студентами были учащиеся, окончившие школу после освобождения Западной Белоруссии от помещичьей Польши. Затем война и немецкая оккупация этих районов опять исключили возможность получить образование детям рабочих и крестьян.

В сентябре 1945 года в большинстве своем парни — будущие студенты — были одеты в домотканые серые свитки. Были случаи, когда приезжали и в лаптях. Так же бедно были одеты девушки. Студенты постарше — демобилизованные из Советской армии после войны.

Для обеспечения нормального учебного процесса книг было недостаточно. Министерство просвещения разрешило закупать книги у частных лиц. Таким образом, мы закупили много литературы у выезжавших в Польшу лиц. Это были книги на немецком, английском и французском языках. Они пригодились для факультета иностранных языков.

Большую партию учебной литературы закупили работники, будучи в командировке в Москве, - Марк Ефимович Левицкий и Гурген Амирханович Мартиросов. Дирекция института частенько отправляла и меня в командировки — в Минск, Москву — в издательство ЦК ВКП(б), библиотеку им. Ленина. Иногда я привозила достаточно литературы, а порой давали только по одному — два экземпляра книг по отдельным курсам, а требовалось, конечно, гораздо больше.

Выручал нас в таких случаях межбиблиотечный абонемент. По нашим заявкам много книг присылала библиотека им. Ленина. Получали литературу и из многих других городов.

Поскольку книг не хватало, студенты вынуждены были заниматься в читальном зале и в кабинетах, которые в ту пору были переполнены.

Начало журнальной библиографии мы позаимствовали в библиотеке Дома офицеров. Мы помогали литературой и вечерней школе — приходилось делиться, потому что в школах в то время почти совсем не было литературы.

Затем, когда страна стала восстанавливаться после войны, заработали издательства. Стало поступать больше литературы по всем курсам. Потребовалось увеличивать и расширять библиотеку. Нас перевели на второй этаж. Выделили для библиотеки отдельную аудиторию, читальный зал. Потребовались стеллажи, лестницы. Их соорудил институтский столяр С.Черток, который после демобилизации из армии вернулся домой и не застал в живых никого из своей семьи. Ректор института Николай Васильевич Власовец устроил его (как и меня) жить в институте. Столяр изготовил высокие стеллажи, ящики и ящички разного назначения. Он помогал нам переносить книги. Нам в те времена приходилось самим и печи топить, и убирать помещение. Когда утром приходили на работу, стоял такой холод в помещении, что невозможно было писать: чернила в чернильницах замерзали. Кололи дрова и топили печи. Ко всему прочему электростанция не обеспечивала город светом. Приходилось нам со студентами работать при керосиновых лампах. Да и ламп этих не хватало. Но все трудности тех лет мы пережили вместе: коллектив библиотеки, студенты, преподаватели, директорский состав, учебная часть. Ко всем у меня осталось теплое чувство благодарности и признательности.

Надо признать, что коллектив библиотеки работал дружно, с душой, не считаясь со своим личным временем. Прощалась я с библиотекой с болью в сердце. Сейчас захожу в университет с трепетом. Смотрю на помолодевшие корпуса, на чудесную разросшуюся библиотеку — и радуется сердце: не зря мы жили и работали...

**ОТ РЕДАКЦИИ.**

**В ноябре этого года Софье Абрамовне Померанц исполняется 95 лет. Она сохранила живой ум и хорошую память, прекрасно помнит события тех далеких послевоенных лет, членов коллектива библиотеки, руководство педагогического института, студентов. Помнят читатели и ее. От их имени говорим: спасибо, Софья Абрамовна. Всего Вам наилучшего!**

# «ДЗЕНЬ, КАЛІ ЎПАЛА СТРАЛА»

Святлана МЕЛЬНІК,
студэнтка IV курса філалагічнага факультэта

Ці неабходна нам сёння ведаць сваё мінулае? Адказам на гэта пытанне будуць словы Ключэўскага: «На матэрыяле гістарычнага мінулага будуецца матрыца будучыні нашага народа».

Так здарылася, што мы — адзін з тых народаў, хто мала ведае, ці нават зусім не ведае сваёй гісторыі.

З кожным днём патрэба ў гэтых ведах узмацняецца.

Вялікі ўклад у вырашэнне гэтай праблемы зрабілі не толькі нашы гісторыкі, але і пісьменнікі, якія звярнуліся да гістарычнай тэмы.

Сярод іх Уладзімір Арлоў. Ён сумяшчае ў сабе гісторыка і пісьменніка адначасова. Гэта чалавек энцыклапедычных ведаў. У беларускую літаратуру ён прыйшоў у першую чаргу як аўтар твораў на гістарычныя тэмы. Гэта «Рандэву на манеўрах», «Таямніцы полацкай гісторыі», зборнік «Дзень, калі ўпала страла».

Зборнік «Дзень, калі ўпала страла» — ні што іншае, як мастацкае бачанне гісторыі.

Як і любы твор на гістарычныя тэмы, зборнік характарызуецца наяўнасцю гістарычнага фону, на якім дзейнічаюць гістарычныя асобы.

Зборнік змяшчае ў сабе дзве аповесці і 6 апавяданняў пра гістарычнае мінулае беларускага народа і ахоплівае розныя перыяды нашай гісторыі, пачынаючы з XIII стагоддзя, калі нашы землі падвергліся крыжацкім нашэсцям.

Перад намі праходзяць постаці выдатных людзей Беларусі: князь Уладзімір, бязбожнік Ян Гус і яго вучань Геранім, паэт Мікола Гусоўскі — стваральнік кнігі пра Беларусь і яго мецэнат Эразм Вітэлій, адданы справе служэння Вялікаму княству Літоўскаму, філосаф-атэіст XVII ст. Казімір Лышчынскі — аўтар трактата «Аб неіснаванні бога», адзін з багацейшых памешчыкаў павета Аляксандр Незабытоўскі, які выступіў супраць несправядлівасці, Людвік Звяждоўскі, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863-64 гг, рэвалюцыянер-народавол Ігнат Грынявіцкі і яго сябры Соф'я Пяроўская і Андрэй Жалябаў.

Побач з імі — дэспаты, захопнікі, здраднікі: біскуп Альберт, Ян Бжоска, Дж. Кантэльмі, Мечыслаў Савініч.

Больш падрабязна спынюся на аповесці «Дзень, калі ўпала страла». Гэты твор дае найбольш доказнае сцвярджэнне таго, што ў аснову зборніка пакладзены гістарычныя падзеі.

Як вядома, у першай палове XIII ст. палітычна раздробленыя і аслабленыя феадальнымі міжусобіцамі землі Беларусі сталі аб'ектам агрэсіі нямецкіх крыжаносцаў і мангола-татар. Шмат крыві пралілося за гэтыя жахлівыя гады на берагах Заходняй Дзвіны і Нёмана.

Месца дзеяння, куды мы пераносімся з аўтарам, — Падзвінне. Бясспрэчны гістарычны факт, што барацьба з крыжакамі была сканцэнтравана менавіта ў гэтым кутку Беларусі. Гэты перыяд у гісторыі нашага народа звязаны з імем полацкага князя Уладзіміра. Гэта ён узначальваў барацьбу з крыжакамі.

Крыжацкая агрэсія пагражала полацкім князям стратай падуладных зямель, ставіла пад пагрозу гандлёвыя сувязі з краінамі Заходняй Еўропы. Менавіта таму полацкія князі вымушаны былі першымі ўступіць у барацьбу.

Кожны з удзельнікаў крыжацкіх паходаў шукаў у іх штосьці для сябе, бачыў нейкую карысць. І гэтыя шматлікія масы рыцараў, гандляроў, духавенства пацяклі ў Лівонію і Літву для распаўсюджвання хрысціянскай рэлігіі.

Князь Уладзімір успамінае тыя часы, «што калісьці як дарагіх гасцей прымаў людзей з чорнымі душамі, якія ў сэрцы сваім хацелі пагібелі яму і ўсёй Полацкай зямлі».

Яшчэ адна гістарычная асоба — біскуп Альберт. Паміж біскупам і полацкім князем ідзе змаганне, якое павінна скончыцца перамогай аднаго.

Але Альберт не можа лічыць сябе поўным пераможцам, нават калі ў 1206 г. полацкае войска на працягу адзінаццаці дзён асаджала, усё ж узяць крэпасць не ўдалося.

Як вядома з гісторыі, пасля перамогі над Кукенойсам, крыжакі захапілі Герцыкі. Барацьба аказалася няроўнай, бо войскаў Альберта было значна больш, а воіны Усевалада былі да таго ж горш узброены. Крыжакі ўварваліся ў горад і пачалі сеяць смерць.

«Два дні крыжакі рабавалі Герцыку, выганялі з хлявоў худобу, зносілі да княжага церама золата, срэбра і пурпур. На трэці дзень, утапіўшы царкоўныя званы і пасекшы мячамі абразы, немцы падпалілі горад і берагам пагналі палон у Рыгу» (с. 29).

У 1210 годзе паміж полацкім князем Уладзімірам і рыжскім епіскапам Альбертам была заключана мірная дамова.

«А кажуць жа, у князя Уладзіміра вечны мір з Рыгай», — зноў загаварыў ён да дзеда» (с.12).

Крыжацкія нашэсці, як вядома, пагражалі не толькі полацкай зямлі, але наўгародскай, літоўскай. А таму, каб не чакаць раптоўнага нападу ворага, у 1216 г. Уладзімір падрыхтаваў сумесны паход палачан, наўгародцаў і літоўцаў супраць ордэна.

«Яшчэ ў студзені, пасля першых чудскіх паслоў, ён на радзе з Віславусам і трыма самымі вернымі баярамі наважыў збіраць сілу» (с. 20).

Надзеі на выніковасць гэтага паходу былі вялікія, але ў дзень выступлення Уладзімір нечакана памёр. Нечакана для тых, хто яго любіў і паважаў, а не для тых, хто жадаў яго смерці.

Асаблівай увагі варты вобраз князя Уладзіміра.

Для мяне гэта чалавек, кожнай часцінкай свайго цела і душы адданы справе служэння радзіме. Ён верыць у магутнасць сваёй дзяржавы, у яе неўміручасць і вечнасць. Дзеля гэтага ён нават гатовы загінуць. Але пакуль жыве — ён будзе змагацца.

Князь Уладзімір з'яднаны з народам, ён верыць, што знойдзе падтрымку ў рукамеснага люду, купцоў, верыць у зямлю сваіх прадзедаў, шануе продкаў і мінулае роднага краю.

«За біскупам — кесар, папа, нямецкія гарады, але за ім, князем Уладзімірам, зямля яго прадзедаў. За ім купцы і рукамесны люд, за ім — цёмныя смерды з вотчын і глухіх весяў... Калі б чужынцы прыйшлі ў полацкія храмы, калі б яны пачалі паліць кнігі і на свой капыл выпраўляць летапісы, продкі ўсталі б са сваіх магіл, і ўзбунтавалася б сама зямля» (с. 20).

Кожнаму чалавеку наканаваны свой лёс. І таму ён крочыць па гэтаму шляху, здзяйсняе задумы і мары. Аб чым жа марыць Уладзімір? Аб славе, з[illegible]абытай у баях, аб вечнай [illegible]мяці? Не, зусім не гэта вабіць яго.

«Не па сваёй волі нараджаецца чалавек, — лежачы без сну, думаў князь. — Але, калі прыйшоў ужо на свет, мусіць зразумець свой лёс і заўжды трымацца той невідочнай стралы, што ляціць праз дні і гады, пазначаючы кожнаму ягоны шлях. Ляціць, пакуль не ўпадзе долу. Тады застанецца толькі памяць аб чалавеку. Аб адным — на год, аб другім — на вякі вечныя. Але ён згодны адмовіцца ад гэтае памяці, толькі б спраўдзілася задуманае» (с. 24).

Страла Уладзіміра ўпала долу ад рук крыжацкіх наймітаў. Але ён пакінуў свой след у гісторыі беларускага народа, і «імя ягонае не згубілася ў стагоддзях» (с. 41).

Творы У.Арлова, якія ўвайшлі ў зборнік «Дзень, калі ўпала страла», прасякнуты глыбокім псіхалагізмам. Амаль у кожным творы гэтага зборніка ёсць асобы, супрацьлеглыя адна другой. Мы выразна бачым героя, улюбёнага ў сваю справу, у свой народ, культуру. Побач з ім — дэспат, забойца, здраднік.

Калі пісьменнік малюе свайго героя, то перад намі партрэт не проста фізічны, але і псіхалагічны.

Творы У.Арлова звяртаюць на сябе ўвагу шматграннасцю адлюстравання жыцця. На гэта ўказваюць выкарыстаныя аўтарам мастацкія сродкі.

Вось як малюе аўтар карціну летняй ночы: «Быў мяккі морак летняй ночы з зялёным танцам светлякоў» (с. 102).

Метафары У.Арлоў выкарыстоўвае найчасцей у дачыненні да з'яў прыроды: «За вокнамі пансіённага дартуара гуляў вецер...» (с. 167).

Метафара ў Арлова перадае таксама душэўны стан героя: «Душа білася ў нераце сумненняў...» (с.103).

«Зямля ў той дзень стамілася піць кроў чалавечую...» (с. 59) — так перадае аўтар жахлівасць ваенных дзеянняў.

У творах У.Арлова мы сустракаем і параўнанні. Выкарыстаны яны для характарыстыкі адной з'явы праз другую: «... людзі — быццам тая гліна: нарадзілася малое, і пачалі яго, як гліну на кружары, абгладжваць і выцягваць».

Наяўнасць гістарычнага фону, гістарычныя постаці і мова мастацкіх твораў У.Арлова даюць падставы гаварыць пра гістарычную аснову зборніка «Дзень, калі ўпала страла».

# СЕМИНАР ЗАВЕРШИЛ РАБОТУ

Успешно работал в 1999/2000 учебном году на факультете психологии и педагогики научно-психологический семинар «Актуальные проблемы современной психологии». Руководитель — доцент кафедры возрастной и педагогической психологии П.А.Ковалевский. За истекший период состоялось 9 заседаний, на которых были заслушаны следующие выступления:

**СЕНТЯБРЬ 1999 г.**

1. Содержательные и структурные характеристики интересов подростков, склонных к правонарушениям.

***Е. Василевич,*** *студентка V курса факультета психологии и педагогики.*

2. Характериологические особенности детей, воспитывающихся в условиях родительской депривации.

***О. Емельянчик,*** *студентка V курса факультета психологии и педагогики.*

**ОКТЯБРЬ 1999 г.**

1. Познавательная активность учащихся с разным типом успешности в обучении.

***Л. Вашкевич,*** *студентка V курса факультета психологии и педагогики.*

2. Рефлексия жизненного пути условно осуждённых с обязательным привлечением к труду.

***Н. Хрищанович,*** *студентка V курса факультета психологии и педагогики.*

**НОЯБРЬ 1999 г.**

1. Роль рефлексии в формировании суицидных проявлений в подростковом и юношеском возрасте.

***Н. Ястребкова,*** *студентка V курса факультета психологии и педагогики.*

2. Отношение к социальной среде несовершеннолетних правонарушителей.

***Т. Томчук,*** *студентка V курса факультета психологии и педагогики.*

**ДЕКАБРЬ 1999 г.**

1. Личностные детерминанты агрессивности подростков.

***И. Тарукина,*** *студентка V курса факультета психологии и педагогики.*

2. Проблема профессионального самоопределения у старшеклассников с девиантным поведением.

***Н. Сидорчук,*** *студентка V курса факультета психологии и педагогики.*

**ФЕВРАЛЬ 2000 г.**

1. Отношение к социальной среде несовершеннолетних правонарушителей.

***Т. Томчук,*** *студентка V курса факультета психологии и педагогики.*

2. Личностные детерминанты агрессивности подростков.

***И. Тарукина,*** *студентка V курса факультета психологии и педагогики.*

**МАРТ 2000 г.**

1. Проблема профессионального самоопределения у старшеклассников с девиантным поведением.

***Н. Сидорчук,*** *студентка V курса факультета психологии и педагогики.*

2. Особенности девиантного поведения подростков разного пола.

***А. Худолей,*** *студентка V курса факультета психологии и педагогики.*

3. Особенности конфликтов в студенческих группах юридического факультета.

***А. Подгайченко,*** *студент V курса факультета психологии и педагогики.*

**АПРЕЛЬ 2000 г.**

1. Влияние тревожности подростка на его статусное положение в группе.

***Е. Зданчук,*** *студентка V курса факультета психологии и педагогики.*

2. Рефлексия в процессе формирования ценностных ориентаций у старшеклассников.

***Я. Ващук,*** *студентка V курса факультета психологии и педагогики.*

3. Социально-психологический портрет военнослужащего (на этапе ранней зрелости).

***Н. Яковлева,*** *студентка V курса факультета психологии и педагогики.*

**МАЙ 2000 г.**

1. Психологические характеристики школьной дезадаптации учащихся.

***С. Иванов,*** *студент V курса факультета психологии и педагогики.*

2. Личностные проблемы одаренного школьника.

***Н. Иванашко,*** *студентка V курса факультета психологии и педагогики.*

3. Особенности эмоциональной сферы дошкольникsв с разным уровнем креативности.

***Т. Шут,*** *студентка V курса факультета психологии и педагогики.*

**ИЮНЬ 2000 г.**

1. Эмоциональная сфера личности в конфликтном взаимодействии.

***Ю. Соколовская,*** *студентка V курса факультета психологии и педагогики.*

2. Динамика профессионального образа «Я» у студентов-психологов.

***Ю. Скрибук,*** *студентка V курса факультета психологии и педагогики.*

3. Профессионально-личностная идентичность педагога.

***И. Земчик,*** *студентка V курса факультета психологии и педагогики.*

**Подготовил П. КОВАЛЕВСКИЙ.**

# ДЕНЬ СЛАВЯНСКОЙ ПИСЬМЕННОСТИ

В нашей республике существуют разные праздники: государственные, религиозные, профессиональные, календарные и др.

В университете состоялся праздник славянской письменности под патронажем кафедры общего и славянского языкознания. Организацией и проведением праздника занимались студенты I курса филфака русского отделения.

Славяне жили и живут в разных государствах, но важно сохранить память о единстве своего происхождения, о близости языков и чувстве славянской общности.

Создателями славянской письменности были Константин (Кирилл) и Мефодий. К ним из III тысячелетия попадают два студента, которые ищут азбуку, путешествуя на машине времени. Из рук солунских братьев они и получают предмет своих поисков. Так началось театрализованное представление, посвященное славянской письменности. Зрители, а это были студенты филфака преподаватели кафедры общего и славянского языкознания, с интересом следили за ходом представления.

Познавательной была викторина из разделов славянской письменности, литературы, культуры и мифологии. Участники викторины проявили активность и определенные знания. Живой интерес вызвал конкурс на знание славянских песен и танцев.

В рамках праздника прозвучали стихи на русском языке в исполнении авторов — студентов и стихи польских, а также белорусских поэтов на языке оригинала.

В программу праздника входила демонстрация изделий, созданных руками студентов. Это были поделки из соломки, кружевные салфетки, вязаные вещи, а также несколько блюд из славянской кухни.

Праздник показал интерес студентов к обычаям, традициям и культурам славян разных стран и народов. Эти знания помогают в решении сложных взаимоотношений между славянскими странами в составе мирового сообщества.

**Михаил АНТОНИ, студент I курса филфака русского отделения.**

# КНІГА ПРА НАС

Яшчэ адна цікавая навінка на паліцах кнігарняў: том папулярнага «Беларускага кнігазбору» — кніга выбраных твораў гродзенскай пісьменніцы XIX стагоддзя, класіка сусветнай літаратуры Элізы Ажэшкі.

У кнізе сабраны найбольш значныя яе аповесці і апавяданні «беларускага цыкла», у якіх раскрываецца жывая гісторыя нашага народа, расказваецца пра тое, як жылі і кахалі, працавалі і весяліліся нашы продкі.

Уяўляю, з якой асалодай будзе смакаваць чытач «густую» прозу Элізы Ажэшкі, з якой неадрыўнай цікавасцю будзе сачыць за драматычнымі момантамі жыцця такіх герояў, як абманутая прайдзісветамі прыгожая і сумленная вяскоўка Хрысціна («Нізіны»), як чацвёра сялян па прозвішчу Дзюрдзі, якія праз сваю цямноту трапілі на лаўку падсудных за забойства «вядзьмаркі» — разумнай, вясёлай і добрай Пятрусі, што ўсім жаночым сэрцам пакахала вясковага хлопца Міхалку і ставрыла з ім сям'ю («Дзюрдзі»), як улюбёны ў прыроду і волю нёманскі рыбак Павел Кабыцкі, што шчыра пакахаў разбэшчаную панскую пакаёўку Франку, якая прынесла яму шмат бядот і якой ён даравыў нават спробу атруціць яго («Хам»), як уцякач-катаржнік Бонк («Зімовым вечарам») і іншыя сустрэтыя пісьменніцай на яе Гродзеншчыне жывыя людзі.

Прыемнай неспадзяванкай для чытача будуць і цікавыя ў многіх адносінах, надзвычай паэтычныя нарысы Элізы Ажэшкі «Людзі і кветкі над Нёманам», якія на працягу 1888-1891 гадоў публікаваліся ў этнаграфічным часопісе Яна Карловіча «Вісла» і з таго часу нідзе не выходзілі. У гэтых нарысах пісьменніца падала 228 беларускіх назваў раслін, апісала выкарыстанне іх у народнай медыцыне, у лячэнні асобных хвароб, што і сёння можа дапамагчы людзям.

Творы Элізы Ажэшкі перастварылі на беларускую мову Янка Брыль, Ядзвіга Бяганская і Галіна Тычка. Уступны артыкул «Каралева жывога слова» напісала Валянціна Гапава.

**Кастусь ЦВІРКА, галоўны рэдактар «Беларускага кнігазбору».**

**220114 г. Мінск, пр. Ф.Скарыны, 145-184. Канстанцін Аляксеевіч Цвірка, тэл. 220-70-27.**

# НАДНЁМАНСКІЯ ГАЛАСЫ

**Своеасаблівая гэта краіна-паэзія... І нават не таму, што такая яна загадкавая і непрадказальная. Адметнасць яе ў тым, што кожны, нават самы малады творца, не адрозніцца часам ад паэта сталага і прызнанага. Назіраць гэта прыходзіцца не раз.**

**Ужо колькі год існуе наша літаб'яднанне, ужо пайшло ад нас не адно паэтычнае студэнцкае пакаленне. Але заўсёды з'яўляюцца новыя творцы, і нават не абавязкова з пачаткам новага навучальнага года. І не пакідаюць яны абыякавым нікога, хто чытае іх вершы.**

**У нашай чарговай падборцы якраз і сабраліся ўсе разам, старэйшыя і маладзейшыя. Але хто з іх які пісаць свядома не буду. Ці істотна гэта для паэзіі?..**

**Святлана ТАРАСАВА,**
**старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры, кіраўнік літаб'яднання «Наднёманскія галасы».**

*Васіліса ПАЗНУХОВА*

## СТИХИ

Стихи рождаются из малости:
Из слез дождя и детской шалости,
Из колокольных перезвонов -
Судьбы неписаных законов.
Из каждого берез листочка
Взлетает новенькая строчка -
Из казусов, порой невольных,
Мурлыканья котов довольных.
Стихи рождаются из мелочи:
Из кос тугих у милой девочки.
Но воспринять должно все это
Большое сердце у поэта.

* * *

А танго желтых осенних листьев
Вплетается в вальс хрустальных дождей.
И где-то вверху лунным светом искристым
Звучит и мелодия песни моей.
У каждого в жизни своя тональность
И свой классический репертуар.
Быть может, мой голос - простая случайность
В руках того, кто его сочинял?
Но я скажу вам литавр ударом
И яростным щелканьем кастаньет,
Что я живу в этих звуках недаром,
Пусть начинающий, но — поэт.

## ЕЛЕНЕ ТРОЯНСКОЙ

Спелым яблоком золотистым
В час, когда пробуждались горы,
Наградила богам ненавистный
Женский пол богиня раздора.
С той поры, порождая войны
И небесный свод потрясая,
Губки, ножки прелестниц стройных
Против воли судьбу решали.
И пока манит свет яблонь белых,
И пока не померкнут взоры,
Сохранят на губах своих девы
Вкус любви и горечь раздора.

*Наталля ГРЫШКЕВІЧ*

## ДОЖДЖ

Дрыжаў пяшчотны цёплы дождж
У тваіх запыленых далонях.
Ты для мяне быў быццам бог
Пад вадаспадам чыстых кропляў.
Блакітная спявала даль
Нязведанай для нас дарогі.
Жыццё нясло на пене хваль,
Мінаючы ракі парогі.
Нам сніцца кожнаму сваё:
То хвалі мора, то аблокі.
Ды ў сне тваім, і ў сне маім
Усё льецца з неба дождж далёкі.

* * *

## НЕ ГРУСТИ

Серый дождь в твоих глазах,
За окошком ветер.
Не блуждай в тревожных снах,
Не грусти о лете.
Не грусти, что невзначай
Осень вдруг подкралась.
Прогони свою печаль,
Что с дождем смешалась.
Завтра будет новый день,
Новые тревоги.
Не грусти, что осень тень
Стелет на дороги.
Не грусти, что холода
Заметут тропинки -
Мы с тобою навсегда
Как две половинки.

* * *

Усю ноч да самага світання
Праплачуць травы ў расе.
Зноў хваля горкага расстання
Цябе кудысьці аднясе.
У небе толькі шолах крылаў,
А на зямлі твае цяпло.
Жыццём паспешліва, вірліва
Мяне ўдалеч аднясло.

* * *

## АПОШНІЯ БУКЕТЫ ЛЕТА

Паволі кружыцца зямля
Усё далей, далей ад лета,
І снег бялюткі спакваля
Закрые сонныя палеткі.
І будзе доўга сніцца сон -
На росным лузеззяюць кветкі,
Плыве ў цішы ледзь чутны звон
Мелодый цяпла сагрэты.
Паволі кружыцца зямля...
Падхопленыя лёгкім ветрам,
Усё лятуць, лятуць з галля
Апошнія букеты лета.

*Андрэй ГАЙСА*

## РАСКЛАД

Ёсць час, калі голас дрыжыць.
Ёсць час, каб змагацца і жыць.
Ёсць час, каб кахаць і дружыць.
Ёсць час, калі нешта баліць.
Ёсць час, калі трэба пісаць.
Ёсць час, каб жадаць і сасніць.
Ёсць час, каб аднойчы сказаць:
Калі ж буду жыць як бяжыць?

## МАЛАНКА

Дождж за празрыстым шклом,
Шэрыя дрэвы.
Дзьме вецер. Бляск сярод кропель вады.
Дождж за дрыжачым шклом.
Змоўклі ўсе спевы.
Навальніца заўсёды - прыкмета бяды.

Уначы, калі заснуць турботы
І горад знікне ў імгле,
Шукаю поўнай адзіноты -
Звярнуцца ў думках да Цябе.
Я многа год хадзіў у бязвер'і
Памілуй, Божа, і даруй.
Не зачыняй да шчасця дзверы,
На шлях мой грэшны не сярдуй.

* * *

Калі вобраз ваш ноччу сасню,
Мне здаецца, што я вас люблю.
Вы заўсёды падобныя промню,
Што душу саграввае маю.
Шмат гадоў задаюся пытаннем,
На якое чакаю адказ:
Няўжо і маё існаванне
Аднойчы сагрэе і Вас?

Рэдактар Людміла Мікалаеўна ДАНІЛАВА

*Заснавальнік: Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.*
Рэгістрацыйнае пасведчанне №519.

Газета набрана, звярстана і надрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы.
ЛП № 111 ад 29.12.97 г.
Вул. Ажэшкі, 22, 230023, г. Гродна.

*Набор і вёрстка:* **М. ВЕРСТАК, В. ЗАКРЭЎСКІ.**
*Карэктура:* **Н. ДУДКО.**

*Здадзена ў набор 25.08.2000.*
*Падпісана да друку: 30.08.2000. 15.00*
*Заказ №242*

Аб'ём - 1 ум. друк. арк.
Наклад 500 асобнікаў.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Наш адрас:* ✉ *230023, г.Гродна, Вул. Ажэшкі, 22, пакой 228.* ☎ *72-08-17.*